

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я.КУПАЛЫ

*№ 11 (239) 2 снежня 1996 года, панядзелак*

## РЭФЕРЭНДУМ: ВОЛЯ НАРОДА

**24 лістапада ў Беларусі праходзіў рэспубліканскі рэферэндум, а ў некаторых акругах - давыбары дэпутатаў у парламент. Народ зрабіў свой выбар, як і на майскім рэферэндуме 1995 года, падтрымаўшы прэзідэнта краіны.**

**Так, за прэзідэнцкі варыянт Канстытуцыі выказаліся 70,45 працэнта ад унесеных у спісы грамадзян рэспублікі, якія маюць права голасу.**

**Як бы кожны з нас ні ўспрымаў вынікі рэферэндума, усім давядзецца лічыцца з тым, што грамадзяне падтрымалі курс Аляксандра Лукашэнкі на правядзенне эканамічнай рэформы, умацаванне дзяржавы, сацыяльны справядлівасць і ўтаймаванне злачыннасці ў грамадстве.**

## ДЗЕЛАВАЯ СУСТРЭЧА

Адбылася сустрэча памочніка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь П.А. Капітулы з выкладчыкамі і студэнтамі універсітэта. Ён спыніўся на найбольш актуальных пытаннях эканомікі і палітыкі дзяржавы, а таксама адказаў на пытанні. У сустрэчы прынялі ўдзел і выступілі намеснік старшыні аблвыканкама Н.Е. Калацэй і намеснік міністра адукацыі і навукі В.Ф. Валадзько.

## ЦЫТАТА НУМАРА:

**"СВАБОДНА ПРЫМЯНЯЦЬ СВОЙ ТАЛЕНТ - ВОСЬ САПРАЎДНАЕ ШЧАСЦЕ".**

**АРЫСТОЦЕЛЬ.**



*Для Сяргея Куклы і Аляксандра Насуты наступіў "зорны" час: работа над курсавымі праектамі. Хлопцы нядрэнна ведаюць камп'ютар, і гэта дапамагае паспяхова працаваць над праграмай.*

*На здымку: студэнты 4 курса фізіка-тэхнічнага факультэта С. Кукла і А. Насута.*

*Фота Ул. САРОКІНА.*

## ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

Нагадваем, што сярод нас ёсць юбіляры. У снежні вы можаце павіншаваць сваіх калег і таварышаў па працы:

*Ірыну Мінаўну* ***АНІШЧЫК*** - старшага выкладчыка кафедры беларускай і рускай моў і методыкі выкладання факультэта педагогікі і псіхалогіі - 2 снежня,

*Генію Міхайлаўну ТАЮРСКУЮ* - супрацоўніцу бібліятэкі - 13 снежня;

*Галіну Іванаўну ПЕДА* - прыбіральшчыцу - 17 снежня.

*ТАБЕ, СТУДЭНТ!*

## ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫІ

Па выніках летняй экзаменацыйнай сесіі ўстаноўлены імянныя стыпендыі студэнтам, якія вучацца на "выдатна" і актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці універсітэта.

Стыпендыю імя Янкі Купалы з 1 верасня атрымлівае студэнт 5 курса другой групы факультэта фізічнай культуры *Сяргей Кісель*, імя Максіма Багдановіча - студэнт 3 курса трэцяй групы факультэта права і эканомікі *Аляксандр Камецкі*, імя Францыска Скарыны - студэнт 4 курса другой групы факультэта гісторыі і культуры *Сяргей Павачка*, студэнт 4 курса першай групы фізіка-тэхнічнага факультэта *Аляксандр Барысёнак.*

*Н. КАРПОВІЧ,*
*метадыст навучальнага аддзела.*

*АФІЦЫЙНА*

## АБМЕРКАВАНА РЭКТАРАТАМ

10 лістапада на чарговым пасяджэнні рэктарата ішла гаворка аб навуковай рабоце на матэматычным факультэце. С дакладам выступіў дэкан матэматычнага факультэта Т.Э. Можджэр. Навуковая дзейнасць факультэта ідзе шырокім планам. Распрацоўваюцца пятнаццаць тэмаў. Шэсць з іх фінансуюцца міністэрствам. Навукова-даследчая работа на факультэце накіравана ў асноўным на падрыхтоўку спецыялістаў.

Дакладчык закрануў і праблемы. А яны ёсць, як і ў кожнай жывой справе. Гэта, у першую чаргу, праблемы станаўлення новай спецыяльнасці на факультэце - эканамічнай кібернетыкі. Ёсць цяжкасці з праграмным забеспячэннем камп'ютарнай тэхнікі. Не хапае падрыхтаваных кадраў.

Даклад Т.Э. Можджэра атрымаў зацікаўленае абмеркаванне і адабрэнне.

Па другім пытанні выступіла метадыст вучэбна-метадычнага аддзела Т.А. Бадзюкова. Яна прапанавала на абмеркаванне рэктарата палажэнне аб рэктарскіх кантрольных работах, як адну з форм кантролю за вучэбным працэсам ва універсітэце. Пасля ўсебаковага абмеркавання палажэнне было прынята як часовае.

У заключным слове рэктар універсітэта Л.М. Ківач звярнуў увагу прысутных на найбольш злабадзённыя пытанні: дысцыпліну студэнтаў, эфектыўнае выкарыстанне аргтэхнікі і тэлефоннай сувязі.

## САВЕТ УНІВЕРСІТЭТА

29 лістапада адбылося чарговае пасяджэнне Савета універсітэта, на якім былі абмеркаваны пытанні выбрання па конкурсу. З паведамленнем на гэту тэму выступіла вучоны сакратар Т.К. Камарова.

Аб рабоце універсітэта па ўдасканаленні сістэмы бесперапыннай падрыхтоўкі спецыялістаў і павышэнні ўзроўню падрыхтоўкі абітурыентаў расказаў дэкан факультэта педагогікі і псіхалогіі В.П. Таранцей. Ён прапанаваў праграму мер па ўдасканаленні гэтай работы.



# Міжнародныя сувязі

## ВІЗІТЫ, КАНТАКТЫ

У рамках сумеснага праекта ТЕМПУС-ТАСІС у нашым універсітэце з візітам пабываў прафесар с Даніі Лейр Таге Ольсан. Госць пазнаёміўся з універсітэтам, з калегамі. А потым адбыліся дыскусіі і абмеркаванні пытанняў, якія цікавілі абодва бакі.

* * *

З 16 па 20 лістапада ў Гродне пабывала дэлегацыя з універсітэта Варвіка (Англія). Нашымі гасцямі былі дырэктар аддзела сувязяў са школамі і каледжамі Розмары Стэмп і старшы памочнік дырэктара універсітэта Кэці Чарльтан.

* * *

25 лістапада ў Англію паехала наша дэлегацыя, у склад якой увайшлі прарэктар універсітэта С.А. Маскевіч, начальнік навукова-даследчага сектара В.В. Сянько і загадчык аддзела міжнародных сувязяў І.Б. Захарчанка. А ў пачатку снежня універсітэцкая дэлегацыя пабывала ў Італіі. У яе склад увайшлі прарэктар, доктар фізіка-матэматычных навук С.А. Маскевіч, начальнік вучэбнага аддзела, кандыдат фізіка-матэматычных навук Ю.Ю. Гняздоўскі, супрацоўнік аддзела замежных сувязяў кандыдат фізіка-матэматычных навук Ю.А. Вайтукевіч.

* * *

Па запрашэнні інстытута ўсходнеславянскай філалогіі Рэспублікі Польшча прафесар кафедры беларускай мовы нашага універсітэта Іван Якаўлевіч Лепешаў у пачатку наступнага года будзе чытаць цыкл лекцый па фразеалогіі беларускай мовы ў Беластоку, у філіяле Варшаўскага універсітэта. Усе выдаткі на праезд, пражыванне і харчаванне нясе польскі бок, які запрашае нашага прафесара.

## "НА ПРАСТОР! НА ШЫРОКІ ПРАСТОР!.."

У лісце да Максіма Танка адзін яго замежны сябра неяк напісаў: "У канцы гэтага, XX стагоддзя, людзі ведаюць адны пра другіх параўнальна больш, чым калі б гэта ні было раней. Аднак, нягледзячы на такі факт, яны, як мне здаецца, аддалены адзін ад аднаго".

Узгадаліся гэтыя словы тады, калі перад сваёй паездкай у Польшчу прыйшлося мне перапытаць добры тузін знаёмых, каб нешта даведацца аб невялікім горадзе Аполлі. А вось жа, здавалася, і ведаем сваіх заходніх суседзяў... А горад гэты ўтульна размясціўся на рацэ Одры ў куточку паміж Германіяй і Чэхіяй.

У канцы верасня 1996 года ў Апольскім універсітэце пачала працу міжнародная навуковая канферэнцыя "Мова і літаратура ўсходніх славян. Сучасны стан і тэндэнцыі развіцця." Абмяняцца думкамі па актуальных праблемах усходнеславянскіх моў і літаратур, сумесна абмеркаваць шляхі развіцця філалагічнай навукі сабраліся навукоўцы з 16 краін свету, у тым ліку з Італіі, Японіі і многіх іншых краін Усходняй і Заходняй Еўропы. Усяго канферэнцыя налічвала каля 200 удзельнікаў. На працягу трох дзён была створана цудоўная атмасфера для абмену думкамі, для замацавання навуковых сувязяў.

У першы дзень удзельнікаў канферэнцыі вітала кіраўніцтва Апольскага універсітэту, вядучыя навукоўцы краін Захаду, якія і стварылі добры працоўны настрой на ўсе наступныя дні. У гэты ж дзень адбылася прэзентацыя кнігі прафесара Вольфганга Казака (Кёльн). "Лексікон рускай літаратуры XX ст.," пададзеный у польскім перакладзе і навуковай рэдакцыі прафесарам кафедры беларускай і ўкраінскай славістыкі Апольскага універсітэта Браніславам Кодзісам. На публічную гутарку па кнізе прафесара В.Казака былі запрошаны ўсе ўдзельнікі канферэнцыі. У гэты ж дзень навукоўцы пачалі працу ў літаратуразнаўчых і мовазнаўчых секцыях.

Нельга не адзначыць шырокай разнастайнасці тэматыкі дакладаў і выступленняў, прысвечаных праблемам літаратуры. Прамоўцамі закранался праблема духоўнасці ў творах пісьменнікаў розных нацыянальных літаратур, асвятляліся малавядомыя старонкі творчасці пісьменнікаў, забароненых і забытых у свой час. Прыемна было адзначыць, што навукоўцы не абмяжоўваліся ўвагай да праблем уласна нацыянальнай літаратуры, а паказалі сваю зацікаўленасць ходам літаратурнага жыцця іншых славянскіх краін. Так, Ірэна Хубіцка (Гданьск) звярнулася да аналізу жаночых вобразаў у прозе Л. Петрушэўскай. Ян Чос прадэманстраваў дасведчанасць у творчасці ўкраінскіх пісьменнікаў, што працуюць у жанры гістарычнай прозы.

Да беларускай літаратуры таксама праявілі значны інтарэс замежныя навукоўцы, у прыватнасці, выкладчык кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта Надзея Панасюк звярнулася да рэлігійных матываў у творчасці сучасных беларускіх паэтаў. Хелена Глоговска (Гданьск) апавядала пра спецыфіку ўспрыняцця беларускай дзіцячай літаратуры XX ст. у Польшчы. Аб тым, што цікавасць да беларускай літаратуры пашыраецца, засведчыў малады навукоўца з Аполля Томаш Вельк, пазнаёміўшы з сучасным успрыняццем твораў В. Быкава ў польскамоўным асяродку.

Відавочным у гэтым плане было тое, што ў беларускай літаратуры замежныя навукоўцы не толькі змаглі абазначыць адметныя бакі нацыянальнага жыцця, але і знайшлі ў ёй духоўны імпульс для ўзбагачэння ўласнай літаратуры і культуры.

Змястоўнымі і актуальнымі з'явіліся даклады і выступленні па праблемах мовазнаўства. Прычым менавіта сярод гэтых навукоўцаў актыўна праводзіліся дыскусіі і абмеркаванні, часам выказваліся амаль палярныя погляды па некаторых спрэчных пытаннях мовазнаўства. Сярод вызначаных праблем найбольшую цікавасць выклікалі наступныя: праблема суадносін наратыўнага і камунікатыўнага тэксту (з пункту гледжання культуры мовы), структура і змест дапаможнікаў па рускай мове для замежных студэнтаў, а таксама і праблема авалодання іншымі ўсходнеславянскімі мовамі поруч з рускай. У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел вядомыя мовазнаўцы: Мая Усеваладава (Масква), Зоя Кёстэр-Тома (Берлін), Рэйнгольд Сяроў (Патсдам), Герман Бідэр (Зальцбург) і многія іншыя. У заключнай частцы канферэнцыі многімі навукоўцамі было падкрэслена, што яшчэ значнае кола праблем чакае свайго абмеркавання і даследвання. Адзначалася, што падобныя мерапрыемствы істотна ўзбагачаюць шырокія перспектывы для супрацоўніцтва, пашыраюць сувязі паміж краінамі. З кожнага боку адчувалася імкненне да агульнага дыялогу, да ўзаемадзеяння. І можна спадзявацца, што такія сувязі будуць развівацца, стануць больш плённымі і багатымі. І што аматары і даследчыкі роднай мовы і літаратуры атрымаюць надзею на новыя цікавыя сустрэчы і не толькі на Еўрапейскім узроўні.

Канкрэтныя крокі ў міжнародным супрацоўніцтве можна зрабіць ужо і сёння. Наш універсітэт мае пагадненне па навуковаму супрацоўніцтву з Апольскім універсітэтам. Таму звяртаемся да кіраўніцтва гістарычнага факультэта, факультэта філалогіі з просьбай падаць канкрэтныя прапановы па супрацоўніцтву ў аддзел міжнародных сувязей універсітэта.

*С. ТАРАСАВА,*
*Выкладчык кафедры беларускай літаратуры.*



# ФАКУЛЬТЭТ ПРАВА І ЭКАНОМІКІ:

## ТВОЙ ВЫБАР

### Характэрныя паказчыкі работы факультэта права і эканомікі за 1991 - 1996 г.

| | 1991 | 1992 | 1993 | 1994 | 1995 | 1996 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць выпускнікоў | 42 | 64 | 85 | 124 | 101 | 114 |
| Працаўладкавана па накіраванні універсітэта | 36 | 57 | 29 | 24 | 61 | 35 |
| Самастойнае працаўладкаванне | 6 | 7 | 56 | 100 | 40 | 79 |

На жаль, табліца, якую мы прапануем, не дае поўны адказ аб працаўладкаванні студэнтаў-выпускнікоў. Тыя, хто атрымаў так званы "свабодны" дыплом, застаюцца як бы за полем зроку універсітэта.

Факультэт права і эканомікі існуе з 1978 года - з часу пераўтварэння педінстытута ва універсітэт. За гэты час пуцёўку ў жыццё атрымалі 11 выпускаў правазнаўцаў і эканамістаў, якія сёння працуюць у абласных, гарадскіх, раённых народных судах, на прадпрыемствах, у сферах прадпрымальніцтва. Гэты факультэт - самы буйны ва універсітэце. На ўсіх формах навучання зараз налічваецца каля 2000 студэнтаў, у тым ліку 824 - на дзённым аддзяленні, 799 - на завочным. Менавіта на гэтым факультэце быў адкрыты першы савет па абароне дысертацый. Тут працуюць знакамітыя вучоныя-юрысты. Выкладчыкі факультэта аказваюць метадычную і практычную дапамогу таксама недзяржаўным вну горада, якія рыхтуюць правазнаўцаў.

З табліцы відаць, што найбольшы рост колькасці выпускнікоў назіраецца 1994 годзе і ў апошнія два гады гэтая лічба стабілізуецца. Гэта можна звязаць з пачаткам платнага навучання. Дарэчы, факультэт дае універсітэту значны прыбытак і дапамагае выжыць тым галінам, якім зарабіць грошы цяжка.

Платнае навучанне прыйшло да нас разам з рыначнымі рэформамі. У многіх краінах яно вельмі добра сябе зарэкамендавала. А ў нас? Можна назваць відавочныя ўжо сёння станоўчыя бакі: ёсць у абітурыента права выбару, а ў навучальнай установы - нейкая матэрыяльная кампенсацыя. Платнае навучанне таксама станоўча адбіваецца на паспяховасці. Бо студэнт, калі ён не абібок, ведае: бацька спытае за тыя грошы, што аддаў на навучанне сына ці дачкі.

Адчуваецца, што прафесія юрыста становіцца найбольш прывабнай для сённяшняй моладзі. І не вельмі засмучае яе тое, што навучанне для нейкай часткі студэнтаў - платнае, галоўнае - набыць элітную спецыяльнасць. Што ж, магчыма, найбольш здольныя з ліку сённяшніх студэнтаў у наступным стагоддзі будуць кіраваць дзяржавай.

Некаторых непакоіць тое, што размеркаванне выпускнікоў ужо страчвае традыцыйнасць. Частка моладзі адмаўляецца ад накіравання на працу, асабліва калі размова ідзе аб раённых цэнтрах, іншых абласцях рэспублікі. І гэта - таксама прыкмета сённяшняга дня. Выпускнікі працаўладкоўваюцца самастойна. Яны маюць права, пачынаючы з трэцяга курса, працаваць у судах, пракуратурах, калегіях, на прадпрыемствах. Хто добра сябе зарэкамендаваў - застаецца працаваць пасля атрымання дыплома.

Перспектыва самастойнага працаўладкавання вымушае студэнтаў больш сур'ёзна адносіцца да практыкі. Выхоўваюцца такія якасці, як самастойнасць у прыняцці рашэнняў, асабістая адказнасць. Ну, а ў каго такіх якасцяў няма, таму не дапаможа дыплом - гэта меркаванне старшыні Ленінскага народнага суда І.І. Грышкевіча.

Вядома, нязначная частка выпускнікоў сёння застаецца як бы на раздарожжы і не адразу знаходзіць работу. Гэта, на жаль, цяжкасці ўсяго сённяшняга грамадства. Яшчэ не ў поўную моц дзейнічаюць рычагі рыначнай эканомікі. Яшчэ толькі пачынаецца фармаванне першапачатковага капіталу ў бізнесе. Калі-небудзь мы ўсё ж такі выйдзем з крызісу і наша краіна стане прававой дзяржавай. Такая перспектыва і вымушае сёння калектыў факультэта шукаць найбольш дзейсныя метады работы, працаваць над паляпшэннем навучальнага працэсу і вырашаць шэраг паўсядзённых праблем.

## СТАЦЬ ГОНАРАМ УНІВЕРСІТЭТА

Мы паспрабавалі выявіць, наколькі сур'ёзна падыйшлі да выбару спецыяльнасці першакурснікі. У анкетаванні ўдзельнічалі 28 студэнтаў факультэта правазнаўства і эканомікі. "Выбраная спецыяльнасць - гэта маё прызванне" - упэўнены 78,6 працэнта апытаных. Толькі 7,1 працэнта рэспандэнтаў няўпэўнены ў тым, што зрабілі правільны выбар. 14,3 працэнта першакурснікаў было цяжка адказаць на пытанне "Вы ўпэўнены, што выбраная вамі спецыяльнасць - гэта ваша прызванне?" Прычым 64,2 працэнта апытаных, адказваючы на кантрольнае пытанне, пацвердзілі, што вучацца на гэтым факультэце па сваім выбары. Аднак адказы іншых рэспандэнтаў не дазваляюць меркаваць, што юнакі і дзяўчаты паступілі на вучобу па жаданні бацькоў.

З цягам часу, з наступленнем сталасці, назапашваннем ведаў (з III курса яны маюць права працаваць па спецыяльнасці) можна дапусціць, узмоцніцца імкненне студэнтаў самазацвердзіцца ў выбранай справе.

Больш выразнае ўяўленне маюць першакурснікі аб магчымай сферы дзейнасці пасля атрымання дыплома. Як станоўчы факт, можна (42,9 працэнта студэнтаў) адзначыць жаданне працаваць у сферы знешнепалітычнай дзейнасці. 17,9 працэнта патэнцыяльных выпускнікоў, якія пакуль што вывучаюць права, хацелі б працаваць у пракуратуры, 10,7 працэнта - у органах унутраных спраў, 7,1 працэнта - у гаспадарчым судзе.

Толькі адзін з 28 першакурснікаў выказаў жаданне працаваць у судзе, аднак пры гэтым ён гатовы быць карысным і ў пракуратуры, і ў органах унутраных спраў.

Насцярожвае нежаданне будучых юрыстаў працаваць у сферы інфармацыйнага і прававога забеспячэння бізнесу. Магчыма, гэта выклікана тым, што пакуль першакурснікі не ўяўляюць сабе нічога аб гэтай сферы дзейнасці.

Яшчэ адно назіранне, выкліканае экспрэс-апытаннем. 14,3 працэнта першакурснікаў заявілі, што ім усё роўна, дзе яны будуць працаваць. Успомніце, што столькі ж апытаных не змаглі сцвярджальна адказаць на пытанне "Вы ўпэўнены, што выбраная вамі спецыяльнаць - гэта ваша прызванне?"

Цікавыя вынікі мы атрымалі, калі задалі студэнтам такое пытанне:"Як вы думаеце, на вашым факультэце створаны неабходныя ўмовы для набыцця глыбокіх ведаў?" 35,7 працэнта апытаных не адказалі сцвярджальна. Столькі ж першакурснікаў лічаць, што на факультэце не створаны неабходныя ўмовы для атрымання глыбокіх ведаў. А вось 28,6 працэнта студэнтаў наогул не змаглі адказаць на гэтае пытанне.

Студэнты займаюць вельмі актыўную жыццёвую пазіцыю, выказваючы свае заўвагі і прапановы. Вось некаторыя з іх: прывесці ў парадак расклад заняткаў; зрабіць навучальны працэс больш цікавым; павялічыць колькасць падручнікаў і метадычнай літаратуры, павысіць яе якасць; зрабіць час навучання больш кампактным; дазволіць вольнае наведванне лекцый; пашырыць бібліятэку; стварыць умовы для зносін старшакурснікаў са студэнтамі першага курса. 10,7 працэнта жадаюць павышэння стыпендый.

Экспрэс-апытанне пацвердзіла: на факультэт правазнаўства і эканомікі прыходзяць невыпадковыя людзі. Студэн-

# РАБОТА НА ПЕРСПЕКТЫВУ

ты асэнсоўваюць, што іх выбар - адказны крок, што яны будуць у хуткім часе адыгрываць значную ролю ў кіраванні дзяржавай. Ва ўсялякім разе, на першы погляд складваецца такое ўражанне: гэтыя першакурснікі ў XXI стагоддзі могуць стаць значнымі фігурамі ў палітыцы, эканоміцы, бізнесе.

Дарэчы, нашы выпускнікі на самой справе - гонар універсітэта. У Ленінскім народным судзе вельмі цёпла адклікаюцца аб нашых выхаванцах. Напрыклад, аб Я.Казяку, С.Ярашэвічу, А.Крывені, якая нядаўна паступіла ў аспірантуру.

- Мне не сорамна казаць, што я - выпускнік Гродзенскага універсітэта, - гаворыць стажор суддзі Яўген Казяк. - Дзякуй факультэту.

**НАШЫ ІНТЭРВ'Ю**

# У ЛЮСТЭРКУ ПРАБЛЕМ

На пытанні карэспандэнта "Гродзенскага універсітэта" адказвае загадчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права прафесар *Мікалай Уладзіміравіч* СІЛЬЧАНКА.

***- На факультэце штогод рыхтуецца вялікая колькасць спецыялістаў. Як можна характарызаваць сённяшні ўзровень іх падрыхтоўкі?***

- Колькасць выпускнікоў расце перш за ўсё за кошт платнага навучання. Зазначу, што немалую частку прыбытку універсітэт мае якраз ад нашага факультэта. А вось наконт узроўню падрыхтоўкі скажу, што ў асноўным нашы выпускнікі сёння займаюць сур'ёзныя пасады ў судах, пракуратурах, органах міністэрства ўнутраных спраў. Гэта кампетэнтныя, высокаадукаваныя людзі.

***- Вы сказалі аб платным навучанні. Ці ёсць нейкая розніца ў методыках ці матэрыяльнай базе? Дарэчы, ці задаволены Вы апошняй?***

- Матэрыяльная база такая ж самая, што і для студэнтаў-бюджэтнікаў. Яе надта добрай нельга назваць. Забеспячэнне слабое. Камп'ютараў не хапае. Выпісваюцца ўсяго два часопісы па спецыяльнасці. Падручнікі старыя, пачатку 90-х гадоў. На дзённае аддзяленне набралі 250 чалавек, а сучасных падручнікаў па агульнай тэорыі права ўсяго 70. Да таго ж лекцыі ў нас у другую змену...

***- Як вы ставіцеся да таго, што сёння многія выкладчыкі чытаюць лекцыі ў недзяржаўных ВНУ, сумяшчаюць гэта з асноўнай работай?***

- Вядома, ёсць пэўныя патрабаванні, і трэба іх выконваць. Калі чалавек добра арганізуе свой час, усюды паспявае, што тут скажаш? Заработная плата не такая ўжо высокая, а трэба жыць. Праўда, на навуковую працу часу застаецца менш...

***- Недзяржаўныя ВНУ правазнаўства - гэта канкурэнты. Ці не атрымаецца лішку спецыялістаў?***

- Гэтае пытанне нікім не вывучаецца. Магчыма, запоўніцца рынак спецыялістамі рана ці позна. А можа здарыцца так, што іх яшчэ доўга не будзе хапаць. Цяпер шмат выпускнікоў самі працаўладкоўваюцца.

***- І ўсё ж такі ў люстэрку гэтых праблем яшчэ ярчэй адлюстроўваюцца набыткі факультэта, яго бурнае развіццё.***

- Так, факультэт мае пэўныя дасягненні, і ў тым ліку ў навуцы. Яшчэ ў 1987 годзе мы першымі ва універсітэце пачалі рыхтаваць кадры праз аспірантуру па спецыяльнасцях 12.0001, 12.0006, 12.0008, 12.0009. Аспіранты ўжо не накіроўваліся ў Мінск, а абаранялі дысертацыі на месцы. Восем чалавек абараніліся ўжо. А ў мінулым годзе на базе універсітэта адкрылі савет па абароне кандыдацкіх дысертацый. Тут таксама дазволена абарона па двух шыфрах.

***- У сённяшніх умовах даволі складана творча працаваць і больш ні аб чым не задумвацца ўсур'ёз. Трэба верыць у нешта высокае. Вы -аптыміст ці ... Вас усё ж такі нешта трывожыць?***

- Я аптыміст.

***- Вы займаецеся навукай. Ці застаецца час на асабістае жыццё? Ці наведваеце Вы тэатр, выставы?***

- На асабістае жыццё часу не хапае. Але на выставах стараюся бываць.

***- Адкуль у Вас такая чыстая беларуская мова?***

- Мабыць, ад бацькі і маці...

*Запісала Л.* ДАНІЛАВА.



# ДЗЕНЬ СТУДЭНТАЎ

Міжнародны дзень студэнтаў, які адзначаўся 17 лістапада, шырока святкаваўся ў нашым універсітэце. У суботні вечар, прысвечаны дню студэнтаў, адбыліся не проста ўрачыстасці. Была падрыхтавана вялікая шоу-праграма з удзелам студэнцкага тэатра эстрадных мініяцюр "Вернісаж".

Наш СТЭМ ведаюць і любяць усе. Поспех яго выступленняў забяспечаны заўсёды.

Склад СТЭМа штогод абнаўляецца. Прыходзяць першакурснікі, а сярод іх ёсць творчыя натуры, з новымі поглядамі. Вось і на святкаванні дня студэнтаў былі падведзены вынікі выступленняў першакурснікаў. Лепшыя нумары і выканаўцы атрымалі пуцёўку ў СТЭМ, а таксама сувеніры і падарункі.



*Радыёфізіка - спецыяльнасць не проста цікавая. Яна ўтойвае шмат нязведанага і нечаканага. Для Аляксандра КРАСНАВІДА таямніц у будучай прафесіі становіцца ўсё менш: юнак ужо на 4 курсе фізіка-тэхнічнага факультэта. Вучыцца добра, асабліва захапляецца на практычных занятках.*

*На здымку: студэнт 4 курса А.Краснавід.*

*Фота Ул.* САРОКІНА.

**РЫНАК ПРАЦЫ**

# СТО ПЕРШЫ СПОСАБ

Як бавіць вольны час? Як напоўніць кашалёк? Для студэнтаў гэтыя пытанні далёка не рытарычныя. Маладыя ды гарачыя галовы прыдумалі, мабыць, каля ста спосабаў дабыцця грошай. Напрыклад, папрацаваць у бацькоў, пазычыць, прадаць джынсы, разгрузіць вагон і г.д.

Каб накіраваць кіпучую энергію ў правільнае русла, за справу ўзяўся фонд сацыяльнай абароны студэнтаў. Прызнаюся: ідэя не новая. Нешта падобнае ўжо спрабавалі арганізаваць у сталіцы. Вырашылі і мы, тым больш, што гарвыканкам пайшоў насустрач, абяцаў нам падтрымку. Вядома, з работай у горадзе зараз напружана, але для студэнтаў, вельмі магчыма, нешта і знойдзецца.

Пачалі з таго, што падрыхтавалі анкеты. Акрамя традыцыйных пытанняў аб даце нараджэння і пашпартных дадзеных тут ёсць і пералік паслуг, якія можа аказваць студэнт: бытавыя паслугі (кур'еры, гувернёры, хатнія работнікі), прыборка і рамонт кватэр. Можна паспрабаваць сябе ў якасці рэкламнага агента альбо повара, прадаўца ці вадзіцеля. А можна перакладчыкам, рэпетытарам або ахоўнікам. У анкету ўнесены таксама пагруза - разгрузачныя, машынапісныя і сельскагаспадарчыя работы.

Студэнту, які не супраць крыху падзарабіць, трэба запоўніць анкету, указаць від працы і час. А астатняе - за намі. Дыспетчарам нашай студэнцкай біржы стала студэнтка-другакурсніца фізіка-тэхнічнага факультэта Лена Белабокая.

Сёння жадаючых паспрабаваць сябе сярод студэнтаў вельмі шмат. Хачу дадаць, што наша біржа не абмяжоўваецца рамкамі універсітэта. Яна для студэнтаў усяго горада, і ўжо ёсць заяўкі ад палітэхнікума і іншых навучальных устаноў. Думаю, справа наладзіцца. Паслугі, якія будуць аказваць студэнты, шмат таннейшыя, чым у цэлым па горадзе.

*Ул.* АНІСЬКА,
*дырэктар цэнтра сацыяльнай абароны студэнтаў, студэнт 4 курса фізіка-тэхнічнага факультэта.*



# "НАДНЁМАНСКІЯ ГАЛАСЫ": НОВЫЯ ІМЁНЫ

*Вось - вось, чакаеш, мацней павее халадам і зацерушыць сняжком зіма.*

*А ў паэзіі пакуль яшчэ пануе восеньскі настрой. Што ж, усіх таленавітых людзей не пакідае раўнадушнай гэтая сапраўды цудоўная, таямнічая пара года. Пісалі аб ёй дзесяткі пакаленняў паэтаў. Пазбегнуць чараў восені здолелі нямногія... Адкрыць для сябе восень спрабавау, я думаю, кожны паэт.*

*"О хараство асенніх дзён празрыстых..." - адзначаў у сваіх вершах Ул. Жылка. "Восень, ты цудоўная, восень дажджлівая..." - выказаўся аб гэтай пары года Цішка Гартны.*

*"Ёсць у восені ціхая-ціхая радасць..." - пажаночаму мякка сцвярджае Таіса Бондар.*

*Якімі б супярэчлівымі ні былі паэтычныя малюнкі восені, відавочна адна яўная заканамернасць - таямніца яе прыцягальнасці, яе хараства застаецца неразгаданай. Па вершах нашых маладых паэтаў можна меркаваць, што і для іх восень стала плённым у творчых адносінах часам. Іх вершы яшчэ раз сведчаць: восенню можна тварыць, восенню можна кахаць, восенню можна сумаваць, а можна яшчэ марыць і спадзявацца.*

*Святлана ТАРАСАВА,*
*кіраўнік літаб'яднання.*

*Анатоль РАМАНЧУК*

## НА АРЭЛЯХ

*Уздыхаючай вераснёвай ноччу сяджу на рэлях, што змайстравау для старэйшага ына ў нашым старым садзе.*

*Сад па-старэчы размаўляе з сабой, я лухаю сад, ноч глядзіць на нас. Гук адаючага ў халодную траву яблыка ераплятаецца-пераліваецца са шляхам ікаючай зоркі.*

*Гайдаюся на арэлях маёй памяці. Сур'і ў ночвах купаюць маладзік. Некалі блыкі былі смачнейшыя, а ноччу іх збіра- русалкі.*

*Дні падаюць у халодную траву забыцця.*

*Успаміны, як зоркі, пранізваюць душу.*

*Гайдаюся на арэлях. Бабуля іх - калыс-, у ёй спіць мой малодшы сын. Яго блыкі самыя смачныя ў нашым старым ераснёвым садзе.*

* * *

*Чалавек жыве ноччу. Яна адна. У ёй мы сустракаемся з сабою. Дзён многа.*
*Яны абавязваюць нас сустрэчамі з іншымі.*
*Адзінокая поўня. У ёй адбіваецца*
*сонечнае святло. Зор - не злічыць, даходзяць*
*да нас іх састарэлыя промні.*
*Так жа ў нашым жыцці, у нашай начы*
*Ёсць нехта, хто шле нам*
*сонечнае святло*
*нават у цемры.*

* * *

*Мы як дрэвы.*
*Мы з імі крэўна зрошчаны.*
*Наш лёс -*
*лёс Лесу -*
*бясконцае прарастанне да Сонца.*
*І цэлы народ - гэта пушча з*
*відушчай душою.*
*І ўсе мы - на ростанях.*
*Мы злучаны з Восенню*
*Ценем крыла.*
*Нас кранае пазнанне -*
*пазнанне дрэва -*
*карэннем туліцца да цела Зямлі*
*і*
*да святла прарывацца атожылкамі.*
*Святая праўда жыцця.*
*Я - дрэва.*

* * *

*Раніцай я падмятаю і палю*
*ўпаўшыя зоркі -*
*лёгкае лісце, што насыпала*
*ля ганка старая ліпа.*
*Вечар мой збірае ў гурбу*
*Няздзейсненыя дзённыя мары.*
*Ноччу гадзіннік меле на сваіх жорнах*
*Спелае збожжа майго быцця.*
*Зацярушвае мякінай падзей мае вочы.*
*Але раніцай моцная ліпа,*
*Грэючы старэчыя пальцы*
*ля майго акна,*
*Усміхаецца.*
*...Ёсць яшчэ лісце залатое...*

## ДАРОГА ДА ГОРАДА

*Раніцой вяртаюся*
*ў горад і бачу,*
*Як ён-небарака*
*бяжыць па дарозе*
*да Восені.*
*У абдымках слупоў нясе*
*дзіўны акварыум вуліц.*
*Пракураныя хмары цягнуць*
*на нітках антэн*
*геаметрычныя гмахі.*
*Восень. Горад.*
*Як ён цяжка ўздыхае -*
*трымаюць пасткі дратоў.*
*Восень спрабуе адкупіцца*
*сваім золатам.*
*Плача самотнымі дажджамі.*
*Горад. Гора.*
*Заміраюць выбухамі*
*ўзятыя ў палон*
*спалоханыя дрэвы.*
*У разбітым люстэрку*
*лужыны шукаю*
*яе сумны погляд.*
*Гора. Восень. Горад.*
*Дарога.*

*Святлана САЛЯНСКАЯ*

## ТРЫЯЛЕТЫ ВОСЕНІ

К. У.

I

Маўкліва акіну паглядам,
Як вецер лістоту адносіць,
Як дрэвы глядзяцца ў просінь,
Маўкліва акіну паглядам.
Як быццам аб нечым нас просіць
Халодная, шэрая восень.
Маўкліва акіну паглядам,
Як вецер лістоту адносіць.

II

Хоць не вернеш назад усё гэта
Бераг. Сонца. Аблокі. Масток.
Памяць часам асвеціць здалёк
Успаміны шчаслівага лета.
І маленькага шчасця глыток
Будзе светам чароўным сагрэты,
Хоць не вернеш назад усё гэта -
Бераг. Сонца. Аблокі. Масток.

III

Як восень, жоўтаю ладдзёй
Нябачна шчасце прамільгнула,
Хоць яркім полымем шугнула,
Ды не пакінула надзей.
Яго б назад я не вярнула,
Нашто мне цень былых падзей...
Як восень, жоўтаю ладдзёй
Нябачна шчасце прамільгнула.



*Васіліса ПАЗНУХОВА*

## ЗАМОВА

*З-за чорнага балота,*
*З-за густога чароту*
*Ідзе ўпотай*
*Панна Яснота.*
*У панны Ясноты*
*Чырвоныя боты,*
*Блакітныя вочы -*
*Яснеюць ночы.*
*Панна Яснота,*
*Тупні ты ботам!*
*Хай ліха пройдзе,*
*Хай людзям сыдзе*
*З сэрца - згрызота,*
*З душы - маркота,*
*З думак - турбота,*
*Са слоў - пустота,*
*З вачэй - самота,*
*З рук - лянота,*
*З хаты - бядота,*
*Са двара - галота,*
*З народа - нядоля,*
*З краіны - няволя!*
*Хай добра будзе! -*
*Дай, прашу, людзям*
*Шчодрага году,*
*Добрага ўмалоту,*
*Прыгожых красак,*
*Шчаслівых казак!*

## САМОТНЫ ВЕРАС

*Самотны верас...*
*Верас, што ты хочаш*
*Злавіць у сеці сцебляў*
*легкавейных?*
*Ці слёзы зіхацяць у кветках*
*ноччу,*
*Ці росныя, крышталныя завеі*
*Пакінулі свой ціхі пацалунак,*
*Пяшчотай атуліўшы кветкі-веі?*

* * *

*Лагодны восеньскі дзянёк*
*Рассыпаў у вышыні аблокі*
*І сарамліва, незнарок*
*Кранае сонцам лісця шчокі.*
*І сумна трохі мне чагось,*
*І радасць светлая навокал.*
*А восень, як жаданы госць*
*Зрабіла небасхіл шырокім.*
*І думкі птушкамі плывуць*
*Удалячынь за лес зялёны,*
*У край, які не дасягнуць,*
*У шлях, нікому не знаёмы.*
*Вяргіня палкая цвіце*
*Пунцовым полымем адчайна,*
*І павуцінне на траве*
*Як быццам з казкі незвычайнай.*

*Дзіяна БУБНОВА*

## ВОСЕНЬ

*Восень... Ціхай хадой падыйшла*
*Услед зялёнаму лету.*
*Ужо, здаецца, было гэта ўсё,*
*І нібыта не гэта...*
*Мне так сёння самотна адной,*
*Душаць нізкія зводы,*
*Ну няўжо ж гэты цяжкі пакой*
*Мне, як крыж, назаўсёды?*
*Хутка след свой праложыць зіма,*
*Па пажоўклай лістоце.*
*Ну, не век жа я буду адна,*
*У гэтай прыкрай самоце.*
*Усё ж надзея жыве ў душы,*
*Што, устаўшы на золку,*
*Я ўбачу: не дождж церушыць,*
*А іграе вясёлка.*
*А з вясёлкай, як птах, да мяне*
*Прыляціць маё шчасце!..*
*...А пакуль толькі восень у акне...*
*Халадэча... Нянасце...*

# БУДУЦЬ НАДБАЎКІ

У нашым універсітэце ёсць структурныя падраздзяленні са шкоднымі ўмовамі працы. Гэта лабараторыі, дзе прымяняюцца розныя хімічныя рэчывы, а таксама лазернае выпраменьванне. Ды і камп'ютары і вылічальная тэхніка таксама ўваходзяць у спіс. Для тых, хто заняты ў гэтых падраздзяленнях, згодна з загадам рэктара прадугледжаны надбаўкі за працу ў шкодных умовах.

Каб вырашыць ступень шкоднасці, неабходна правесці атэстацыю рабочых месцаў. З гэтай мэтай створана спецыяльная камісія, якую ўзначальвае прарэктар па навуковай працы С.А. Маскевіч. У склад камісіі ўвайшлі прадстаўнікі прафкама, бухгалтэрыі, факультэтаў - усяго 11 чалавек. Атэстацыя будзе праводзіцца пры дапамозе спецыяльных картаў.

Для таго, каб гэта работа прайшла ў сціслыя тэрміны, кіраўнікам структурных падраздзяленняў неабходна прадставіць на імя рэктара інфармацыю аб наяўнасці шкодных умоў працы. Хачу напомніць кіраўнікам, што гэту работу неабходна правесці хутчэй, каб камісія змагла вызначыць ступень шкоднасці і атэставаць рабочыя месцы, бо ад гэтага залежыць матэрыяльны стан нашых жа калег.

У мінулым годзе надбаўкі за шкоднасць атрымлівалі 110 чалавек. Сёлета, магчыма, гэта лічба будзе вышэйшай, бо тэхнічная аснашчанасць універсітэта паляпшаецца з кожным годам, а, значыць, павялічваецца і колькасць персаналу, які яе абслугоўвае.

*М.ЛЕВАНДОЎСКІ,*
*інжынер па тэхніцы бяспекі.*

---

**ТАБЕ, СТУДЭНТ**

## ВЫДАТНІКАМ БЫЦЬ НЯДРЭННА

За кошт сродкаў стыпендыяльнага фонду ўстаноўлены надбаўкі да студэнцкай стыпендыі за выдатныя поспехі ў вучобе, грамадскім жыцці і навуковай рабоце.

У лістападзе на надбаўкі выдзелена 137600000 рублёў. Гэтыя грошы размеркаваны паміж факультэтамі, і ўжо на месцах будуць вызначаны канкрэтныя сумы для выдатнікаў.

Відавочна, што вучыцца на "выдатна" не толькі прэстыжна, але і выгадна, прыварак атрымліваецца важкі. Так што жадаем поспехаў. Ваша стаpанне, дарагія студэнты, будзе заўважана і адзначана.

*Т. ГЕРАШЧАНКА,*
*галоўны бухгалтар.*

## ПРЫВАРАК СПАРТСМЕНАМ

Не засталіся па-за ўвагай студэнты, якія здабываюць спартыўную славу роднаму універсітэту. Для забеспячэння лепшай работы аддзялення спартыўнага ўдасканалення па падрыхтоўцы спартсменаў-студэнтаў загадам рэктара па універсітэту залічаны на ліміты дадатковага харчавання з 1 кастрычніка па 30 чэрвеня наступнага года 64 студэнты-спартсмены. Гэта тыя, хто ўваходзіць у зборную па грэка-рымскай, вольнай барацьбе, самба, дзюдо і гандболу (жанчыны).

Спартсменам прадастаўляецца права навучання па індывідуальным плане.

## ДАПАМОЖНІК ДЛЯ ЗАВОЧНІКАЎ

Вучэбна-метадычны дапаможнік "Кантрольныя заданні і метадычныя ўказанні па нямецкай мове" прызначаны для студэнтаў спецыяльнасці П.02.02; П.04.02; 03.08 завочнай формы навучання. Дапаможнік складзены на аснове патрабаванняў "Праграмы па нямецкай мове для гуманістычных факультэтаў нямоўных спецыяльнасцей універсітэтаў" (М., 1987).

Мэтай дапаможніка з'яўляецца падрыхтоўка студэнтаў-завочнікаў да самастойнага чытання арыгінальнай літаратуры па спецыяльнасці з атрыманнем неабходнай інфармацыі.

Дапаможнік складаецца з двух частак. Першая ўтрымлівае кантрольныя заданні і метадычныя ўказанні па нямецкай мове. Другая частка прадстаўляе сабой тэксты для дадатковага чытання, тэматыка якіх адпавядае праграмам па асноўнай спецыяльнасці студэнтаў-філолагаў і студэнтаў факультэта педагогікі і методыкі пачатковага навучання: біяграфіі пісьменнікаў і навукоўцаў, урыўкі з манаграфій, спецыяльныя агульныя і аглядальныя артыкулы.

Да тэкстаў дадзены тлумачэнні, якія ўключаюць фразеалагічныя агульныя, ідыяматычныя выразы і тэрміны, якія выклікаюць цяжкасці пры перакладзе. Складзены дапаможнік на факультэце замежных моў старшым выкладчыкам Е.А. Сматрыцкай і выкладчыкам С.А. Бабук.

---



**1 ДЕКАБРЯ - ВСЕМИРНЫЙ ДЕНЬ БОРЬБЫ СО СПИДОМ**

## СПИД НЕ СПИТ

Ни одно заболевание в XX веке не вызывало такого ужаса и паники, такой перестройки служб здравоохранения и научных учреждений, такой реакции общественности и прессы, как СПИД. Это объясняется такими необычайными обстоятельствами, как быстрое распространение болезни, высокая летальность среди заболевших, необычная эпидемиология и отсутствие эффективных методов лечения и особенно профилактики.

В нашей республике пандемия ВИЧ-инфекции в считанные месяцы из абстрактной угрозы превратилась в реальную действительность. К середине октября этого года в Беларуси лабораторно и клинически установлен диагноз ВИЧ-инфекция у 234 человек, из них в Гродно -у 3 человек.

Мы попытались определить уровень знаний по проблеме СПИД у самой передовой части молодежи - у студенчества. С помощью анонимной анкеты Т.Березиной (1994) определялся комплексный показатель риска заболеть СПИДом у 304 студентов (211 женщин и 93 мужчин) младших курсов нашего университета в возрасте 17 - 19 лет.

Установлено, что незначительную по численности группу составили студенты с минимальным показателем риска - 3,2 процента среди юношей и 6,6 процента среди девушек. Для них характерны "максимальные" знания об опасности СПИДа, а лучшим предохранительным средством при занятии сексом они считают отсутствие таких занятий. Вторая группа - "осторожные", которые руководствуются принципом: береженого и Бог бережет (64 процента среди студентов и 68 процентов среди студенток). "Охотно рискующих", не всегда задумывающихся о последствиях, соответственно 32 и 25 процентов.

Добрачный опыт половой жизни отметили 88,2 процента юношей и 61 процент девушек. Причем на регулярные половые контакты указывают более половины студентов (58,3) и почти треть студенток (30 процентов). Сторонники свободных сексуальных отношений не видят ничего предосудительного и тем более опасного в частой смене партнеров. Легко прощают измену и того же требуют взамен около 10 процентов респондентов. Любовь за деньги (в порядке исключения) не отрицают 29 процентов студентов и 25,4 процента студенток, а у 2 процентов респондентов "это" получается даже часто. На желание половой близости с незнакомым половым партнером указывают 40 процентов юношей и 6,2 - девушек. Особенно настораживает тот факт, что, зная о презервативе, как о способе профилактики СПИДа, большинство респондентов пользуется им от случая к случаю (53,8 процентов студентов и 25,4 - студенток). Вообще отрицают использование кондома около 20 процентов респондентов.

Результаты проведенного анкетирования позволили констатировать существующий риск заболеть СПИДом среди студенческой молодежи. Особенно сейчас, когда наблюдается рост заболеваемости и у нас, в Беларуси, основной мерой профилактики должно быть отрицательное отношение к случайным половым связям, потому что в большинстве случаев опасности заражения люди подвергают сами себя.

Наибольшую эпидемическую значимость имеет половой путь, особенно при гомосексуальных контактах. В последнее время возрос удельный вес заражения при гетеросексуальных контактах. Опасность заражения резко возрастает при частой смене партнеров. Передача вируса реальна через донорскую кровь в случае отсутствия тестирования крови на антитела к ВИЧ. Интенсивное распространение вируса имеется среди наркоманов, вводящих наркотики внутривенно одним шприцем. Возможны заражения вследствие использования недостаточно обработанного или повторно используемого медицинского инструментария (шприцев многократного применения, катетеров). Не исключается заражение через повторно используемые без дезинфекции бритвенные и маникюрные приборы. Не отрицается возможность заражения при использовании общей зубной щетки и других предметов личной гигиены.

*В.ПРОКОПОВИЧ,*
*А.ШПАКОВ,*
*доценты кафедры основ медицинских знаний и охраны здоровья детей.*



СПОРТ

# ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ

Гонар і славу нашаму універсітэту прыносяць спартсмены па грэка-рымскай барацьбе. Дастаткова сказаць, што зборная каманда вобласці фармуецца цалкам з нашых студэнтаў і выпускнікоў. Многія з іх - члены галоўнай каманды рэспублікі. Жывём напружана. Толькі крыху астынем ад адных спаборніцтваў - рыхтуемся да другіх. У пачатку лістапада ездзілі ў Мінск на спартакіяду вну Рэспублікі Беларусь. Занялі другое месца. Чаму? Прыкрая выпадковасць. У дарозе зламаўся аўтобус. Каб не спазніцца, прыйшлося выйсці на трасу і "галасаваць". Ну, а хто, скажыце, спыніцца, калі на бязлюднай дарозе стаяць дужыя хлопцы-спартсмены? Вадзіцелі нас прымалі зусім не за студэнтаў...

Мы ўсё ж такі спазніліся на гэтыя спаборніцтвы, але каманду дапусцілі да ўдзелу выключна дзякуючы нашай спартыўнай славе. Як-ніяк, вядучая каманда рэспублікі. Выступілі нядрэнна: трое спартсменаў сталі чэмпіёнамі - першакурснік Расім Ніфталіеў, студэнт другога курса Аляксандр Ліра і пяцікурснік Аляксандр Сідарэнка. На другое і трэцяе месцы выйшлі таксама па тры спартсмены з нашай каманды.

Наступны старт - у Гомелі, дзе мы таксама паказалі сябе выдатна, а 20 лістапада - спартакіяда ў Санкт-Пецярбургу. Спартакіяда ў Мінску, аб якой я больш падрабязна расказаў, прайшла як адборачныя спаборніцтвы да чэмпіянату свету ў Іране, які адбудзецца ў снежні. Мяркую, многія нашы спартсмены трапяць у зборную каманду.

Студэнты часам пытаюцца, калі і як пачынаў развівацца ў нашым універсітэце гэты від спорту. Я ахвотна расказваю першакурснікам аб нашых традыцыях, а сёння нагадаю і чытачам нашай універсітэцкай газеты.

Грэка-рымская барацьба ва універсітэце як від спорту пачала актыўна развівацца ў пачатку сямідзесятых гадоў, калі пачаў працаваць ва універсітэце майстар спорту Вячаслаў Аляксандравіч Максімовіч. Сёння ён загадчык кафедры фізічнага выхавання, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, заслужаны трэнер СССР і Рэспублікі Беларусь, трэнер зборнай каманды краіны.

Я таксама трэніраваўся ў Вячаслава Аляксандравіча і магу сказаць, што ён не толькі прафесійны спартсмен і педагог, але і чулы чалавек, патрабавальны ў першую чаргу да сябе. Ён выхаваў больш за 30 майстроў спорту, восем майстроў міжнароднага класу. Сярод іх - заслужаны майстар спорту, тройчы чэмпіён Еўропы Анатоль Федарэнка.

Нагадаю, што сёлета на Алімпійскіх гульнях у Атланце студэнт другога курса факультэта фізкультуры Аляксандр Паўлаў заваяваў сярэбраны медаль, наш выпускнік Валерый Цыленьць - бронзавы медаль, а студэнт пятага курса Аляксандр Сідарэнка - чацвёртае ганаровае месца. Гэта - вялікі поспех, нашы спартсмены прывезлі два медалі, у той час як уся каманда Беларусі - 15 узнагарод. Вядома ж, пераможцаў вітаў увесь народ, іх запрасіў на прыём прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

Па хадайніцтву факультэта фізічнай культуры В.А. Максімовіч прадстаўлены да дзяржаўнай узнагароды. Калектыў шчыра радуецца за калегу, для многіх, як і для мяне, Вячаслаў Аляксандравіч з'яўляецца і трэнерам, і настаўнікам.

*А. КУДЗЕЛЬ,*
*старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання.*

## КУРСЫ ПА МЕНЕДЖМЕНТУ

Сённяшнім студэнтам давядзецца працаваць у новай школе, у новы час. А гэта патрабуе ад выкладчыкаў пастаяннага ўдасканалення метадаў работы з аўдыторыяй.

З мэтай павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў часта арганізоўваюцца тыя ці іншыя курсы. Вось і ў снежні заканчваюць работу курсы для загадчыкаў кафедр па менеджменту. Гэтае слова а, дакладней, паняцце, не так даўно ўвайшло ў нашае жыццё.

Навука кіравання вытворчасцю патрабуе адпаведнай падрыхтоўкі. Гэта прадыктавана часам.

*Письмо в редакцию*

Благодарим ректорат, профком, коллектив преподавателей, сотрудников и студентов, друзей и учеников Василия Павловича Козлова.

Нижайший поклон и искренняя признательность за помощь и поддержку в тяжкую годину утраты.

*Семья Козловых.*

## КОЗЛОВ Василий Павлович



27 октября 1996 г. закончилась земная жизнь доброго и светлого человека - доцента кафедры русской и зарубежной литературы Гродненского государственного университета имени Янки Купалы Козлова Василия Павловича.

Он родился 7 марта 1922 года в д. Сталки Чаусского района Могилевской области в крестьянской семье. Учился в Могилевском педучилище, затем в Могилевском пединституте. Учеба была прервана войной. До победного 45-го Козлов В.П. в действующей армии. "Помнит Вена, помнят Альпы и Дунай" этого храброго солдата. Воинская должность Козлова В.П. отмечена высокими наградами, среди них орден Отечественной войны, орден Красной звезды. После войны Василий Павлович продолжил учебу, затем работал преподавателем Оршанского учительского института.В 1955 году судьба привела Козлова В.П. в наш Гродненский пединститут. Здесь он проработал более 40 лет, отдавая свою творческую энергию и исключительный организаторский талант на благо нашего вуза. Здесь он защитил кандидатскую диссертацию, был деканом историко-филологического факультета, проректором по учебной работе,более 10 лет заведовал кафедрой русской и зарубежной литературы. За успехи в научной и педагогической деятельности Козлов В.П. был награжден орденом Трудового Красного Знамени.

Василий Павлович был замечательным лектором. Он тонко чувствовал литературу, он верно ей служил. О золотом XIX веке говорил эмоционально и проникновенно. Сотни благодарных учеников В.П. Козлова сохранят в памяти его лекции о Л.Н. Толстом и Ф.М. Достоевском, об А.П. Чехове и И.С. Тургеневе. Все сказанное им было согрето личным отношением, искренностью, страстностью. В.П. Козлов был тактичным, скромным, отзывчивым человеком, мудрым и внимательным собеседником. В памяти тех, кто его знал, кто имел счастье у него учиться, с ним работать, он навсегда останется олицетворением удивительнейшей обаятельности и человеческой мудрости.

Имя Козлова В.П. навсегда вошло в историю Гродненского университета.

*Коллеги и ученики.*

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.*

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.

Газета набрана, звярстана і аддрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта.

*Рэдактар* Л.ДАНІЛАВА.

*Набор і вёрстка:* І. ПАТОЦКАЯ, Ю.РАДС.

Газета выходзіць адзін раз у месяц.
Аб'ём - 1 друк. арк.

*Здадзена ў набор 19.11.96*

*Заказ* ____

*Наклад 500 асобнікаў.*

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас:* ✉ *г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 228.* ☎ *72-08-17.*